**СМОЛІК** Аляксандр Іванавіч (н.1944), беларускі культуролаг, гісторык. Доктар культуралогіі (2000), кандыдат гістарычных навук (1973), прафесар (1999). Скончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.Горкага (1968). Працаваў дацэнтам у гэтым інстытуце, дэканам факультэта дауніверсітэцкай падрыхтоўкі (1979—92). З 1992 прарэктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры. Даследуе гісторыю Беларусі, тэорыю айчыннай і сусветнай культуры. На аснове структурнага аналізу ім вызначана сацыядынаміка культуры, сутнасць, асаблівасці, змест і дзейнасць сацыяльных інстытутаў посткатастрофнага грамадства. Распрацаваў канцэпцыю рэабілітацыйна-катарсіснага ўздзеяння на дэзадаптаваную асобу постакатастрофнага соцыуму мастацтва (музыкі, тэатра, выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтваў, літаратуры, харэаграфіі і інш.). Шэраг прац прысвечаны даследаванню працэсу разгортвання культуры этнасаў у часе і прасторы і ва ўзаемасувязі з сацыяльна-палітычнай арганізацыяй, сацыяльнымі ўзрушэннямі грамадства. Аўтар манаграфій “Сацыядынаміка культуры ў посткатастрофным соцыуме” (1999), “Гісторыя і культура беларускіх татар” (2000; разам з І.Б.Канапацкім), “Сацыяльна-культурная дзейнасць у постчарнобыльскім соцыуме” (1999), “Культура Беларусі XI—XIX стст.” (1998) і інш.